Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЛІПЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 140 (28250)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Не пакідайце дзяцей без нагляду

СТАР. 3



У аптэку па мурашыны спірт?

СТАР. 4



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## Зялёныя вітамінкі



Фота БЕЛТА.

Механізатар Сяргей ХЛЕБАКАЗАЎ.

**Больш за 500 тон зялёнага гарошку сабрана і пастаўлена на перапрацоўку агароднікамі КСУП «Брылёва» Гомельскага раёна. Да канца сезона ў гаспадарцы плануецца сабраць 900 тон вітаміннага прадукту.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў:**

*«МУС падрыхтавала прапановы па забеспячэнні бяспекі ў навучальных установах. Мы праінфармавалі Міністэрства адукацыі, унеслі свае прапановы, каб сумеснымі намаганнямі вырашыць пытанне бяспекі. Ідзе выпрацоўка гэтых рашэнняў. Падкрэслю, што гэта кампетэнцыя Міністэрства адукацыі, МУС выступае тут у ролі эксперта і службы, якая забяспечвае грамадскі парадак у цэлым. Сярод канкрэтных мер — забеспячэнне ўнутранай бяспекі навучальных устаноў, наяўнасць кваліфікаванай аховы, прапускных рэжымаў».*

■ Выбары-2016

## АГІТАЦЫЯ ПАВІННА БЫЦЬ ПА ЗАКОНЕ



**Перадвыбарная гонка ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пачынае набіраць абароты. Ініцыятыўныя групы сфарміраваныя, і ўжо ідзе збор подпісаў за ўдзел у выбарах кандыдатаў у дэпутаты. У хуткім часе вызначацца ўдзельнікі выбараў і пачнецца агітацыя сярод насельніцтва, у якой будуць задзейнічаны ў тым ліку і СМІ. За апошнімі будзе пільна сачыць створаны Назіральны савет. Першы намеснік міністра інфармацыі і старшыня Назіральнага савета па кантролі за захаваннем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў СМІ Ігар ЛУЦКІ падрабязна расказаў карэспандэнту «Звязды» пра тое, чым менавіта будуць займацца члены Савета падчас перадвыбарнай кампаніі, а таксама выказаў свае рэкамендацыі для СМІ ў гэты перыяд.**

**— Якім чынам Назіральны савет ажыццяўляе сваю дзейнасць? Што ён менавіта адсочвае?**

— Назіральны савет у складзе старшыні, намесніка, сакратара і членаў прызначаецца пастановай Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК). Савет па сваіх функцыях назірае за тым, як праходзіць асвятленне выбараў у краіне. Міністэрства інфармацыі таксама праводзіць маніторынг у рамках выканання Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі»; у тым ліку мы назіраем за тым, што адбываецца ў працэсе асвятлення падрыхтоўкі і правядзення выбараў кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Таксама маніторынгам займаецца і Беларускі саюз журналістаў (БСЖ). Калі казаць канкрэтна, то Назіральны савет сочыць за тым, каб у краіне былі забяспечаны аднолькавыя прававыя магчымасці для агітацыі сярод кандыдатаў у СМІ. Любы кандыдат у дэпутаты можа звярнуцца са сваім пытаннем аб працы сродкаў масавай інфармацыі па асвятленні выбараў у Назіральны савет, і мы не пакінем гэта без увагі.

СТАР. 2

■ Актуальны рэпартаж

## «СПАЧАТКУ ВЕЛЬМІ НАСЦЯРОЖАНА СТАВІЛІСЯ ДА КАПЕЕК...»

### Карэспандэнты «Звязды» даведаліся, як людзі ўспрынялі новыя грошы

**Прайшло ўжо тры тыдні, як краіна жыве з новымі грашыма. Як ідзе адаптацыя? Ці можам мы ўжо сказаць, што прызвычаіліся да іх? У чым асноўныя цяжкасці прывыкання? Каб знайсці адказ на гэтыя пытанні, мы вырашылі адправіцца на самы буйны рынак сталіцы — Камароўку, дзе ўсе разлічваюцца наяўнымі. Моладзь звычайна лёгка прыстасоўваецца да любых перамен, таму мы гутарым з пажылымі пакупнікамі.**

...Падыходзім да прылаўкаў, на якіх роўненькімі радкамі стаяць вялікія пластыкавыя кубкі з чарніцамі, вішнямі, малінамі, агрэстам. Па той бок — бабулькі і пажылыя жанчыны гадоў 65–70. Выбраўшы, што будзем купляць, працягваем грошы адной з гандлярак: 5 рублёў новымі купюрамі і дваццаць тысяч — старымі. І тут жа пытаемся жанчыну:

— Ці не блытаецеся з рознымі грашыма?

— Блытаюся пакуль... — шчыра прызнаецца тая, красамоўна махаючы рукой. І тут жа дзеліцца з намі гісторыяй са свайго жыцця, якраз у тэму.

СТАР. 3



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9780 ▼ | |
| Еўра | 2,1798 ▲ | |
| Рас. руб. | 0,0309 ▼ | |
| Укр. грыўня | 0,0797 ▼ | |

ISSN 1990 - 763X

16140

# АГІТАЦЫЯ... ПА ЗАКОНЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Савет можа разглядаць таксама спрэчкі, якія ўзнікаюць падчас асвятлення ў СМІ дзейнасці кандыдатаў у дэпутаты. Акрамя таго, мы можам даваць рэкамендацыі і заключэнні. Пры гэтым апошние слова ў любой спрэчцы заўсёды застаецца за ЦВК.

**— Наколькі больш складана сачыць за парадкам правядзення агітацыі ў СМІ ў час шырокага доступу да інтэрнэту?**

— Работа стала больш складанай з-за таго, што з'явілася шырокае поле для ахопу і маніторынгу. Міністэрства інфармацыі і Назіральны савет гэтую работу праводзяць. З улікам таго, што ў нас ёсць папулярныя рэсурсы, на якіх часцей за ўсё грамадзяне абменьваюцца думкамі не толькі ў момант выбараў, але і ў любы іншы час, менавіта яны і аналізуюцца ў першую чаргу. Але трэба разумець, што закон аб СМІ для ўсіх адналькавы і адпаведна ўсе артыкулы закона распаўсюджваюцца на інфармацыйныя рэсурсы ў інтэрнэце, за выключэннем пытанняў рэгістрацыі. Таму ў нас з пункту гледжання заканадаўства аднолькавы падыход да назірання за ўсімі відамі СМІ, незалежна ад таго, друкаваныя яны, электронныя або тэлевізійныя.

Варта адзначыць, што сацыяльныя сеткі ахапіць досыць складана. Але пакуль што асаблівай агітацыйнай актыўнасці там не прыкмячаецца.

**— Якія СМІ (інтэрнэт, друк, радыё, тэлебачанне) сёння найбольш папулярныя для вядзення агітацыйнай дзейнасці сярод кандыдатаў у дэпутаты?**

— Друкаваныя СМІ, радыё і тэлебачанне сёння пакуль яшчэ застаюцца найбольш актыўнымі крыніцамі агітацыі, аднак інтэрнэт «наступае», і яго нельга здымаць з рахункаў. Варта таксама адзначыць, што, згодна з Выбарчым Кодэксам Рэспублікі Беларусь, дакладна размеркаваны аб'ёмы інфармацыйных паведамленняў і час для правядзення бясплатнай агітацыі сярод насельніцтва ў СМІ. Усё гэта прапісана ў Палажэнні аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, якое прынята ЦВК. У ім вызначаны друкаваныя СМІ, у якіх кандыдат можа апублікаваць перадвыбарную праграму. Таксама там пазначана, што кандыдатам у дэпутаты прадастаўляецца эфірны час для тэледэбатаў і для выступлення на радыё і ТБ. Гэта зроблена для таго, каб ураўняць доступ кандыдатаў да СМІ і зрабіць выбары максімальна аб'ектыўнымі.

**— А калі ў кандыдата ёсць старонка ў сацыяльнай сетцы, на якой ён вядзе агітацыю сярод сваіх падпісчыкаў, ці будзе адбывацца назіранне за ёй?**

— Кандыдату ў дэпутаты не забараняецца выкарыстоўваць сацыяльную сетку пры ўмове, што ў агітацыйную дзейнасць не будуць укладвацца матэрыяльныя сродкі. Можна параўнаць гэта з тым, як праводзяцца агітацыйныя пікеты на вуліцы ці як некаторыя наведваюць дамы патэнцыйных выбаршчыкаў. Хтосьці гэта робіць, а хтосьці — не. У выпадку, калі ў агітацыю ў сацыяльнай сетцы ўкладваюцца сродкі, то гэта павінна быць зроблена афіцыйна, бо на правядзенне агітацыі, згодна з законам, ствараецца фонд у памеры 1000 базавых велічынь, што сёння складае 21 тысячу дэнамінаваных беларускіх рублёў. Дарэчы, выкарыстоўваць сродкі гэтага фонду можна на правядзенне агітацыі ў любым СМІ і ў любым аб'ёме. Гэта значыць, кандыдат можа выдаткаваць усе сродкі фонду на агітацыю, скажам, у газеце, не звяртаючыся да паслуг радыё або тэлебачання. Галоўнае — не выйсці за ліміт вызначаных законам сродкаў.

> **Таксама не трэба мэтанакіравана сутыкаць супрацьлеглыя пункты гледжання і ствараць канфліктныя сітуацыі. На мой погляд, выбарчая кампанія мусіць праходзіць максімальна аб'ектыўна і справядліва пры асвятленні яе журналістамі.**

**— Чаму ў Савет не ўвайшлі прадстаўнікі прыватных СМІ і БАЖ?**

— Яны першапачаткова не падалі заяўкі ў ЦВК. Міністэрства інфармацыі накіравала свае прапановы ў ЦВК, і яны былі разгледжаны і задаволены. Ужо пасля разгляду прапановы ў Цэнтрвыбаркаме міністэрства накіравала свой запыт і БАЖ. Чакаецца, што ў бліжэйшы час ЦВК прыме рашэнне аб тым, ці будуць уключаны прадстаўнікі Беларускай асацыяцыі журналістаў у склад Назіральнага савета.

**— Якія рэкамендацыі для СМІ і кандыдатаў у дэпутаты вы можаце даць падчас перадвыбарнай гонкі: што неабходна рабіць, а чаго трэба пазбягаць?**

— Кандыдатам у дэпутаты варта памятаць пра тое, што напісана ў артыкуле 47 Выбарчага Кодэкса Рэспублікі Беларусь. У любым асяроддзі распаўсюджвання інфармацыі неабходна выконваць умовы артыкула. Агітацыйныя перадвыбарныя матэрыялы, агітацыйныя матэрыялы па рэферэндуме, выступленні на сходах, мітынгах, у друку, па тэлебачанні, радыё не павінны ўтрымліваць прапаганды вайны, заклікаў да гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, абразаў і паклёпу ў дачыненні да службовых асоб Рэспублікі Беларусь, кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты. Таксама забараняюцца агітацыя ці прапаганда сацыяльнай, расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці моўнай перавагі, выпуск і распаўсюджванне паведамленняў і матэрыялаў, якія абуджаюць сацыяльную, расавую, нацыянальную ці рэлігійную варожасць. У выпадку невыканання гэтых умоў прымяняюцца меры, у тым ліку і да СМІ.

Усім журналістам і кіраўнікам СМІ, якія займаюцца асвятленнем перадвыбарнай кампаніі і размяшчэннем агітацыйных матэрыялаў кандыдатаў у дэпутаты, варта абавязкова азнаёміцца з артыкуламі 45, 46, 47 Выбарчага Кодэкса Беларусі.

Таксама не трэба мэтанакіравана сутыкаць супрацьлеглыя пункты гледжання і ствараць канфліктныя сітуацыі. На мой погляд, выбарчая кампанія мусіць праходзіць максімальна аб'ектыўна і справядліва пры асвятленні яе журналістамі. Але перш за ўсё варта выконваць закон і пастановы ЦВК. Усім кіраўнікам СМІ я таксама раю праводзіць семінары са сваімі журналістамі, каб яшчэ раз абмеркаваць пытанні правядзення агітацыі ў перыяд выбараў.

Што тычыцца кандыдатаў у дэпутаты, то, улічваючы, што гэта выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і кандыдатаў чакае барацьба за галасы выбаршчыкаў пэўнай акругі, на мой погляд, вельмі важна весці агітацыйную дзейнасць у рэгіянальнай прэсе. Гэта значыць, выкарыстоўваць СМІ там, дзе агітацыйныя матэрыялы будуць даходзіць да патэнцыйнага выбаршчыка.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

# МНС: УРАГАНЫ ПАКАЗАЛІ БЕСКЛАПОТНАСЦЬ ЛЮДЗЕЙ

**Першая палова мінулага тыдня азмрочылася для краіны ўраганамі і моцнымі ліўнямі. Пад самыя магутныя ўдары стыхіі па чарзе трапілі Шаркаўшчына, Дзяржынск, Мінск, Смалявіцкі раён... Шквалісты вецер паваліў безліч дрэў, пазрываў дахі з дамоў. Ліквідацыя наступстваў разгулу стыхіі ідзе і дагэтуль.**

— Як толькі сіноптыкі абвяшчаюць аб патэнцыйна небяспечных прыродных з'явах, мы заўжды пра гэта папярэджваем людзей і даём канкрэтныя рэкамендацыі аб правільных паводзінах, — паведаміў **міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.** — Але шмат хто з людзей прадэманстраваў сваю бесклапотнасць. Вось раілі напярэдадні не паркаваць аўтамабілі пад дрэвамі. Хтосьці не прыслухаўся да нашых парад, а стыхія гэта не даравала. Цяпер думаюць, што за ўвесь урон мусіць плаціць нехта іншы, напрыклад дзяржава. Трэба ж і самім быць больш абачлівымі. Дзяржава, безумоўна, дапамагае, і мясцовыя выканаўчыя камітэты прымаюць рашэнні аб кампенсаванні ўрону. Але мушу адзначыць, што тыя, хто застрахаваў сваю маёмасць не толькі абавязкова, але і добраахвотна, атрымліваюць амаль стапрацэнтную кампенсацыю шкоды. Вось толькі, калі стаіць добрае надвор'е, пра тое чамусьці забываюць і хочуць на гэтым сэканоміць.

Міністр зазначыў, што падчас разгулу стыхіі абстаноўка заставалася кантраляванай.

— Усе неабходныя захады рабіліся без залішняй бюракратыі. Пашкоджаныя жылыя будынкі і гаспадарчыя пабудовы аднаўляліся аператыўна. І цяпер будаўнічыя матэрыялы выдаюцца тым, хто мае ў гэтым патрэбу. З дзяржаўнага рэзерву іх было адпушчана на суму 400 тысяч дэнамінаваных рублёў.

Галоўнае, што падчас стыхіі не гінуць людзі. Разам з тым «фокусы», якія выкідвае надвор'е з часоў сумнавядомага «Хаўера» ў сакавіку 2013 года, дапамагаюць яшчэ больш удасканальваць працу Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Да таго ж ратаўнікі раяць карыстацца спецыяльнай праграмай для смартфонаў «МЧС: помощь рядом!», які ўжо спампавалі на свае мабільныя прылады каля 12 тысяч чалавек. Яна вас загадзя папярэдзіць аб патэнцыйна небяспечных з'явах надвор'я і падкажа, як правільна паводзіць сябе ў разнастайных надзвычайных сітуацыях. Бясплатная праграма даступная ў краме Google Play.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Сітуацыя

# «ЯК ТОЛЬКІ ПРЫБЫЛІ РАТАВАЛЬНІКІ, ЛІСТ БЛЯХІ ЎПАЎ З ДАХУ»

**Начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ШПАРЛО выказаў падзяку Алене СІНКЕВІЧ за праяўленую ёй неабыякавасць у сітуацыі, якая пагражала жыццю і здароўю людзей.**



Фота Яраслава ВАНОКЕВІЧА.

18 ліпеня ў Гродне на плошчы Савецкай распачаў работу школьны кірмаш, у якім удзельнічае і індывідуальны прадпрымальнік Алена Сінкевіч. У той дзень яна гандлявала школьнымі прыладамі, аднак прыйшлося паклапаціцца і пра іншае. У 16 гадзін 15 хвілін у цэнтр аператыўнага кіравання абласнога ўпраўлення МНС паступіў трывожны званок. Алена Сінкевіч паведаміла, што ёсць пагроза падзення ліставой бляхі з даху будынка гасцініцы «Нёман». Моцным ветрам ліст сарвала з мацавання і ён ляжаў на даху проста над уваходам у рэстаран.

— Як толькі ратавальнікі прыбылі на месца і нацягнулі стужку, ліст бляхі ўпаў з даху. Зразумела, якія наступствы маглі здарыцца, калі б Алена Сінкевіч не праявіла актыўную жыццёвую пазіцыю, — зазначыў Сяргей Шпарло. — Дзякуй ёй і ўсім грамадзянам, якія, стаўшы відавочцам сітуацыі, што пагражае жыццю і здароўю людзей, своечасова праінфармавалі службу ратавання. Прыемна, што такіх прыкладаў неабыякавасці становіцца ўсё больш. Дзякуючы ім, у прыватнасці, сёлета ўдалося ў пачатковай стадыі ліквідаваць шэраг узгаранняў сухой расліннасці, пазбегнуўшы буйных пажараў, якія маглі б закончыцца знішчэннем домаўладанняў і гаспадарчых пабудоў.

Нават тое ж пакрыццё даху ў выпадку прыроднага катаклізму становіцца сур'ёзнай пагрозай людзям. Як гэта здарылася нядаўна ў Гродне, калі ліст шыферу, што ўпаў з даху будынка, моцна траўміраваў жанчыну.

Сяргей Шпарло падарыў Алене Сінкевіч кнігу «Старонкі гісторыі пажарнай службы» і запрасіў яе на прафесійнае свята беларускіх ратавальнікаў, якое адзначаецца 25 ліпеня. У гэты дзень у парку імя Жана Эмануэля Жылібера і на плошчы Леніна для жыхароў і гасцей горада над Нёманам пройдуць выстава тэхнікі, гульні, конкурсы, канцэрт эстрадна-духавога аркестра МНС і юных вакалістаў. А маладыя ратавальнікі прысягнуць на вернасць Радзіме.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## Дыялог бізнесаў

# ВАЖНЫ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД ДА КОЖНАГА РЫНКУ

**Інструменты прасоўвання беларускай прадукцыі павінны быць інавацыйнымі і розлічанымі на індывідуальны падыход да кожнага рынку, адзначыў намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ на сустрэчы беларускіх дыпламатаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў краіны. Гэта тычыцца таксама і шырокага выкарыстання магчымасцяў інтэрнэту. Акрамя таго, ён выказаў меркаванне, што бізнес-супольнасць сумесна з гандлёва-прамысловай палатай, дыпламатычнымі місіямі краіны павінны аб'ядноўваць свае сілы ў прасоўванні айчыннай прадукцыі. Таксама падчас мерапрыемства пасльі і прадстаўнікі дзелавых колаў абмяркоўвалі найбольш важныя пытанні пашырэння экспарту беларускай прадукцыі.**

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Ізраілі Уладзімір СКВАРЦОЎ** адзначыў, што рынак Ізраіля для Беларусі вельмі цікавы па шэрагу экспартных кірункаў.

«За пяць гадоў тавараабарот з Ізраілем павялічыўся ў 2 разы. Аднак яго аб'ём усё яшчэ досыць невялікі і складае каля 130 млн долараў. Значную частку ў нашым экспарце складаюць камп'ютарныя, фінансавыя, транспартныя паслугі», — адзначыў Уладзімір Скварцоў.

Усяго за першыя 5 месяцаў сёлета экспарт беларускіх тавараў склаў у гэтую краіну 13 млн долараў, паслуг — каля 7,7 млн долараў. Ізраіль інвестуе ў аграпрамысловы комплекс, інфармацыйныя тэхналогіі, збор і ўтылізацыю адпрацаваных машынных маслаў, у будаўнічую сферу нашай краіны.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Славакіі Ігар ЛЯШЧЭНЯ** расказаў пра планы па нарошчванні прысутнасці нашых малых і сярэдніх прадпрыемстваў на рынку Славакіі. Туды з Беларусі цяпер актыўна пастаўляецца прадукцыя «Гомсельмаша» і «Амкадора», таксама ёсць дылеры для прадпрыемстваў сярэдняга аб'ёму вытворчасці, і ўжо знойдзены дылеры для «Лідаграпраммаша» і «Бабруйскаграмаша». Акрамя гэтага, важнай сферай застаецца гуманітарнае супрацоўніцтва. У бліжэйшы час цесная кааперацыя будзе ажыццяўляцца ў галіне турызму, адукацыі, навукі і культуры.

Супрацоўніцтва са Славакіяй мае вялікае значэнне яшчэ і дзякуючы створанаму там сумеснаму цэнтру сертыфікацыі беларускай прамысловай прадукцыі для адпаведнасці патрабаванням еўрапейскага рынку. Гэта дазволіць істотна пашырыць спіс беларускіх тавараў, якія адпавядаюць усім нормам і патрабаванням ЕС.

Стала вядома, што Беларусь і Італія дамовіліся пакінуць у сіле праект, які называўся Італьянская прамысловая акруга. Па словах **Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Італіі Аляксандра ГУР'ЯНАВА,** ён павінен быў з'явіцца на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны «Брэст». У адпаведнасці з рамачным пагадненнем там для італьянскіх кампаній быў выдзелены ўчастак. Цяпер беларускі бок чакае візіту прадстаўнічай дэлегацыі па лініі Міністэрства эканамічнага развіцця Італіі, які павінен адбыцца ў хуткім часе.

Паводле слоў Аляксандра Гур'янава, дзве краіны таксама рэанімавалі работу па шэрагу пагадненняў па навукова-тэхнічным, культурным супрацоўніцтве, ратыфікацыя якіх не была даведзена да канца. Акрамя таго, дыпламат адзначыў, што Італія нарошчвае закупкі беларускай мэблі, а таксама дрэваапрацоўчай і металапрадукцыі. У цэлым, паводле слоў пасла, сёння італьянскі бізнес разглядае Беларусь як пляцоўку для выхаду на рынак ЕАЭС. Ён нагадаў, што ў нашай краіне працуе больш за 200 кампаній з італьянскім капіталам, якія ў асноўным прадстаўляюць малы і сярэдні бізнес. Беларускі бок разлічвае, што следам за імі ў краіну пачнуць прыходзіць і буйныя прадпрыемствы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# «СПАЧАТКУ ВЕЛЬМІ НАСЦЯРОЖАНА СТАВІЛІСЯ ДА КАПЕЕК...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

— Нядаўна атрымала пенсію новымі грашыма і вырашыла аддаць пазыку сяброўцы. А тая адмовілася браць новыя купюры, сказала, прынось у старых грашах. Прыйшлося ісці ў краму, мяняць новыя грошы на старыя, — смяецца наша суразмоўца і разам з ёю смяюцца суседкі-гандляркі.

***

84-гадовая Ніна Іванаўна прыйшла на Камароўку купіць балотных дурніц. Гаворыць, што вельмі цяжка пенсіянерам зараз разбірацца з гэтымі новымі грашыма.

— Мне сацыяльная работніца прынесла пенсію ў новых грашах, — расказвае пажылая жанчына. — Я прыйшла ў краму і кажу: я даю вам новыя грошы — і вы мне рэшту дайце такімі ж. А касірка не паслухала мяне і дала як новымі, так і часткова старымі. Я стаю і не магу разабрацца, а яна мне яшчэ і нагрубіла, маўляў, праходзьце хутчэй, у мяне тут чарга. І так і не патлумачыла, што яна мне дала, а я сама дык і не разабралася...

Ніна Іванаўна так расхвалявалася, што нават ледзь не расплакалася.

— Я вайну перажыла, на будоўлі працавала, потым — выхавальніцай у дзіцячым садку. Але цяпер няма павагі да старасці, — лічыць, што жанчына ўсё яшчэ не можа адысці ад сваёй крыўды. — Зараз некаторыя несумленныя прадаўцы могуць ашукваць старых...

***

А вось 78-гадовай Кацярыне Лявонцьеўне касірка, наадварот, дапамагла разабрацца з новымі купюрамі.

— Мяне доўга не было ў Беларусі, толькі нядаўна вярнулася. У першы дзень дэнамінацыі прыйшла ў краму і нават разгубілася: на ўсіх цэнніках ужо новыя лічбы, — успамінае жанчына. — А маладая касірка мне тут жа ўсё перавяла: сказала, колькі гэта будзе, калі лічыць па-ранейшаму. Дзякуй ёй за гэта!



**Атрымала пенсію новымі грашыма і вырашыла аддаць пазыку сяброўцы. А тая адмовілася браць новымі купюрамі, сказала, прынось у старых грашах.**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Але, тым не менш, да ідэі адкінуць нулі ў грашах Кацярына Лявонцьеўна ставіцца не вельмі добра. «Старым людзям гэта складана, трэба ламаць галаву кожны раз. І гэтыя капейкі... — са скрухай уздыхае яна. — Я не магу разабрацца, не бачу, якая там лічба выбіта, на гэтай манетцы. Але што зробіш, давядзецца прывыкаць...»

***

Побач з намі сталы мужчына выбірае апельсіны і расплачваецца старымі купюрамі. У адказ на наша пытанне пра новыя грошы смяецца: «Я іх яшчэ ў руках, можна сказаць, і не трымаў, толькі адну капейку...» Але ставіцца да іх 74-гадовы Станіслаў Якаўлевіч добра. «Ведаеце, раней быў такі жарт: хочаш быць мільянерам — прыязджай у Беларусь, — прыгадаў ён. — Дык вось, трэба было правесці дэнамінацыю хаця б для таго, каб так не жартавалі». Дарэчы, калі мужчына даведаўся, што мы са «Звязды», вельмі ўзрадаваўся. «Я ў вас нават публікаваўся, але вельмі даўно, вас, магчыма, яшчэ й на свеце не было...» — сказаў ён.

...А гандлярка, у якой купляў апельсіны наш суразмоўца, усміхнуўшыся, сказала, што спачатку людзі крыху блыталіся з грашыма. І, па яе словах, вельмі насцярожана бралі капейкі. «Але цяпер, як не падаецца, усе ўжо прызвычаіліся, — гаворыць жанчына. — І з пажылымі пакупнікамі таксама няма ніякіх праблем».

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

---

■ Надвор'е

## Лета вяртаецца

**Самы цёплы летні месяц узяў даволі працяглую паўзу. Ужо даўно тэрмометры на большай частцы тэрыторыі краіны не паказвалі ўдзень больш за 25 градусаў. Але ў гэтыя выхадныя сітуацыя пачне змяняцца.**

Сіноптыкі паведамляюць, што сёння на надвор'е будуць яшчэ ўплываць атмасферныя франты ад цыклону з цэнтрам на паўночным усходзе Украіны. Чакаецца воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Вецер будзе пераменных напрамкаў, умераны, пры навальніцах парывісты. Удзень паветра прагрэецца да плюс 20–25 градусаў. У заходніх раёнах прахалода захаваецца: там слупкі тэрмометраў не ўзнімуцца вышэй за 19 градусаў.

А вось на выхадныя надвор'е нас парадуе летняй цеплынёй. Уначы чакаецца 11–18 градусаў цяпла, днём у суботу паветра прагрэецца да плюс 21–27, у нядзелю цяпло прыбавіць яшчэ два-тры градусы. Кароткачасовыя дажджы пройдуць толькі месцамі.

Па папярэднім прагнозе, у пачатку наступнага тыдня ртутны слупок дасягне 30-градуснай адзнакі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

---

■ Правілы на лета

# НІ НА СЕКУНДУ!

## Дзеці і дарослыя маглі б пазбегнуць многіх траўмаў. Спецыялісты даюць некалькі практычных рэкамендацый



Фота БЕЛТА.

**Да канца года па краіне плануецца адкрыць цэнтры бяспекі для павышэння інфармаванасці бацькоў (на базе РНПЦ «Маці і дзіця», а таксама ва ўсіх абласцях). Гэта будзе навучанне правілам паводзінаў і дома, і на вуліцы, і наогул... Бо сёння бацькі так устурбаваныя, напрыклад, тым, з якога матэрыялу зроблены матрац ці ложак, што забываюцца пра не менш важнае: апускаць матрац на больш нізкі ўзровень па меры таго, як дзіця падрасло. Словам, не хапае нам ведаў. І многія каментарыі ў сацыяльных сетках да артыкулаў, звязаных з нядаўнімі падзеннямі дзяцей з вокнаў, паказваюць, наколькі моцна кульгае ўяўленне аб тым, што ды як трэба рабіць дзеля бяспекі.**

Вось асноўнае, на што трэба звярнуць увагу.

**Дарожна-транспартныя здарэнні.** З гэтай прычыны з пачатку года ўжо загінулі 168 чалавек і атрымалі траўмы 1921 чалавек.

✓ Набывайце дзіцячыя крэслы. Незалежна ад таго, дзе вы або вашы дзеці сядзіце — прышпільвайце і прышпільвайцеся, бо на заднім сядзенні таксама можна атрымаць несумяшчальную з жыццём траўму.

✓ Перачакайце дрэннае надвор'е. Імкніцеся пазбягаць руху ў цёмны час сутак.

✓ Вам нельга садзіцца на матацыкл, калі вы не ўсведамляеце, што на высокай хуткасці можа занесці так, што загіне той, хто стаяў, здавалася б, удалечыні.

✓ Калі вы веласіпедыст, то выконвайце адпаведныя правілы руху, пацікаўцеся, з якога боку вы павінны рухацца. Калі вы пешаход, не хадзіце па дарожках для веласіпедыстаў — гэта нават проста дрэнны тон.

✓ У цёмны час сутак карыстайцеся флікерамі.

✓ На якім бы відзе транспарту вы ні рухаліся, ніколі не забывайце пра ўсемагчымыя ахоўныя сродкі.

**Утапленні.** Гэта самая распаўсюджаная прычына гібелі нашых дзяцей ад траўмаў. Сёлета ўжо патанулі 19 дзяцей (летась было 14). Загінулі такім чынам і 154 дарослыя.

— Утапленне можа быць як у натуральным вадаёме (рэчка, возера), так і ў канале, у канавах, калодзежы і нават бый адзін няшчасны выпадак у ванне, — кажа **намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Леанід ЛОМАЦЬ.** — На базе нашай установы створаны Рэспубліканскі спінальны цэнтр для пацыентаў з траўмамі і захворваннямі пазваночніка. Кругласутачная экстранная брыгада гэтага цэнтра выязджае ва ўсе рэгіёны на выклікі, звязаныя з траўмамі, атрыманымі падчас нырання, а гэта пераломам пазваночніка, сціскане спіннога мозга. Выклікаў сёлета навант больш, чым летась, а ў сярэднім бывае каля 300 у год. У палове выпадкаў апераці пры пераломах пазваночніка праводзяцца на месцы — для гэтага ёсць магчымасці ў рэгіёнах. Буйное аддзяленне для пацыентаў з такімі траўмамі адкрыта ў Гомельскай вобласці. У складаных выпадках, калі, напрыклад, патрабуецца не адно хірургічнае ўмяшанне, пацыент дастаўляецца ў рэспубліканскі цэнтр.

➢ Растлумачце дзецям, што ныраць небяспечна. Памятайце, што яны ўхітраюцца паказваць майстар-клас на такім мелкаводдзі, дзе толькі адны гусі плаваюць.

➢ Будзьце пільнымі і адзін да аднаго. Каб вы не сталі сведкам такога дзікага выпадку, які здарыўся не так даўно. Мужчына добра выпіў, пайшоў купацца і ўдарыўся падчас купання галавой. Тыя, з кім ён быў, параілі выпіць яшчэ, той выпіў, зноў нырнуў і зноў ударыўся. Падчас трэцяй спробы ўжо зламаў шыю...

**Падзенні з вышыні.** У апошнія гады з гэтай прычыны гіне каля 15 дзяцей у год. У першую чаргу, варта прыгадаць нядаўнія выпадзенні малых дзяцей з вокнаў шматкватэрных дамоў. Дасканалае вывучэнне кожнай сітуацыі гібелі і ратавання адной дзяўчынкі засяроджваюць увагу на некалькіх момантах. Галоўны з іх — неабачлівасць дарослых.

✓ Новыя шклопакеты вельмі лёгка паддаюцца дзецям. Неабходна ўстанаўліваць вокны з запорамі, якія будуць абмяжоўваць магчымасць адкрыцця вокнаў малымі.

✓ Прыбірайце любую мэблю на балконе і ў пакоях, якую дзіця лёгка можа выкарыстаць як прыступку. У большасці выпадкаў дзеці, якія выпалі з вокнаў, скарысталіся нейкімі дапаможнымі сродкамі, а далей супраць іх спрацавала недасканалая каардынацыя. Дзяўчынку, якая выжыла пасля такога падзення, выратавала маскітная сетка, на якой яна нібы планіравала.

— Пры ацэнцы ўзроставай структуры дзяцей, якія загінулі ад знешніх прычын, высвятляецца, што найменшыя поспехі ў забеспячэнні бяспекі дасягнуты ў групе ад 0 да 4 гадоў, — адзначае **загадчыца лабараторыі клінічнай неанаталогіі, рэабілітацыі нованароджаных і дзяцей першага года жыцця РНПЦ «Маці і дзіця» Таццяна ГНЯДЗЬКО.** — Калі ў старэйшых групах усё ж такі праводзіцца нейкая прафілактычная работа, то тут усё цалкам залежыць толькі ад бацькоў, а яны часта не ведаюць, што і як трэба рабіць.

➢ Не пакідайце дзяцей не тое што на хвіліну — на секунду. Не пакідайце іх і на старэйшых дзяцей. Майце на ўвазе, нярэдка бывае, што недагледзелі за дзецьмі нават бабулі і дзядулі.

➢ Ніколі не пакідайце дзіця без нагляду каля вады. Для самых малых глыбіня на ўзроўні 20 см — гэта ўжо небяспечна! Пажадана закрываць басейны, устаноўленыя на дачах, рабіць іх недаступнымі ў той час, калі вы не можаце быць побач. Не пакідайце каля басейна цацкі, якія могуць упасці і спраўкаваць у дзіцяці жаданне іх дастаць. Калі ваша дзіця ў ванне, басейне ці любой іншай вадзе, а вам трэба адысці на хвілінку, бярыце дзіця з сабой.

**Мужчына добра выпіў, пайшоў купацца і ўдарыўся падчас купання галавой. Тыя, з кім ён быў, параілі выпіць яшчэ, той выпіў, зноў нырнуў і зноў ударыўся. Падчас трэцяй спробы ўжо зламаў шыю...**

➢ На дзіцячай пляцоўцы не пакідайце дзяцей адных, нават самых паслухмяных і занятых сваёй справай. Перасоўвацца па пляцоўцы трэба следам за малым. Дзіця павінна быць на адлегласці выцягнутай рукі.

➢ З увагай у наша жыццё манет трэба памятаць аб магчымасці траўматызацыі страўнікава-кішачнага тракта. Любы дробны прадмет не павінен трапляць у рукі дзіцяці да 3 гадоў, якія ўсё спрабуюць на смак! Вызначце месца для сумак, у якіх захоўваюцца кашалькі, і прывучыце гасцей класці сумкі туды, куды дзіця не дацягнецца.

➢ Памятайце, што самыя небяспечныя памяшканні ў любым доме — кухня і ванны пакой. Тут дзіця ніколі не павінна знаходзіцца адно. У ванным пакоі, па меншай меры, пакладзіце на падлогу гумавы дыванок. Устанавіце абарончыя экраны каля пліты на кухні. Або гатуйце, пакуль дзеці не падрасцуць, на задніх фаерках. Сродкі бытавой хіміі трэба старанна хаваць. Шафы павінны зачыняцца так, каб адчыняць маглі толькі дарослыя. Абмяжоўваць дзіця ў свабодным руху дапамогуць хадункі і манеж.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Ракурс

# У АПТЭКУ ПА «ФУФЫРЫКІ»

## Некаторыя залежныя не грэбуюць нават мурашыным спіртам

**Малады хлопец, што стаяў у чарзе ў аптэцы, паводзіў сябе нервова: перамінаўся з нагі на нагу, церабіў валасы, вопратку... Нарэшце не вытрымаў і заявіў з раздражненнем: «Што так марудна? Можна крыху хутчэй?»**
**Калі чарга падышла да яго, адбыўся такі дыялог:**
**— Ламівіт.**
**— Усё зразумела...**
**— Я не для сябе!**
**«Ага, не для сябе... Выпівоха! — канстатавалі ў чарзе. — Такі малады, а ўжо на ламівіт перайшоў. Відаць, грошай зусім няма...»**



Фота носіць ілюстратыўны характар.

### «Яна была для мяне проста як горкая вада»

— Да нас ужо з раніцы выстройваюцца чэргі восьтакіх пастаянных «кліентаў», што пакутуюць ад «смагі», — уздыхае фармацэўт. — Купляюць усё запар, абы спірт у рэцэптуры прысутнічаў. Зусім грэбуюць навват мурашыным спіртам, а ён жа — толькі для вонкавага прымянення.

**Чалавек прыняў прэпарат і праз 10 хвілін супакоіўся... Але негатыўныя наступствы застануцца з ім на гады.**

Я абышла шэраг аптэк, і ніводзін фармацэўт не здзівіўся пытанню наконт алкаголікаў. Кожны прыгадаў некалькі такіх пастаянных «пакупнікоў». Калі пералічыць колькасць алкаголю, які змяшчаецца ў бутэльцы гарэлкі і ў настойцы на спірце, то атрымліваецца, што сёння купляць алкаголь у аптэцы танней, чым у краме. І людзі «з перагарам» гэта хутка зразумелі. «Прасунутыя» алкаголікі змешваюць стымулюючыя настойкі і заспакаяльныя і разводзяць усё гэта газіроўкай.

Як правіла, па такія «лекі» ідуць ужо алкаголікі са стажам, якія і хацелі б выпіць звычайнай гарэлкі ці «чарніл», ды грошай бракуе. Але нам давялося пазнаёміцца і з рэдкім прыкладам менавіта «аптэчнага алкаголіка». 56-гадовы Мікалай з дрыготкімі рукамі і пакорліва-сумным поглядам звычайную гарэлку зусім не п'е. Затое «фуфырыкі» (так на жаргоне называюць алкагольныя сурагаты) ужывае ўжо амаль 8 гадоў. Ён з гонарам кажа, што ніколі не меў аніводнага прагулу ці парушэння (Мікалай — трактарыст, раней працаваў кіроўцам), і распавядае, як першы раз выпіў адразу цэлы флакончык настойкі і «славіў хвалю» (звярніце ўвагу на яго лексікон — як у наркамана). Але пасля таго, як дзеянне «лекаў» прайшло, з'явіліся апатыя, абыякавасць да ўсяго. Тады ён выпіў яшчэ флакончык...

«Мне настойку з аптэкі падабаецца піць больш, чым гарэлку ці віно, — гаворыць Мікалай. — Таму што яна не замінае працы. А вось калі вып'ю шклянку спіртнога — пасля ўздыму ідзе дрымотнасць».

Але з цягам часу мужчына заўважыў, што і дома, і на працы ўсё, як яму здаецца, добра, усё задавальняе, толькі пакуль ёсць лекі ў арганізме. А як пройдзе 2-3 гадзіны, лекі выведуцца — усё раптоўна становіцца дрэнным.

Аднойчы, пасля некалькіх тыдняў ужывання, калі ён выпіваў да 6 флаконаў за дзень, пачалося недамаганне. «Ломка ў суставах была, вядома, не такая, як у наркаманаў, але прысутнічала. Вып'ю флакон — яна паволі праходзіць, — успамінае Мікалай. — Яшчэ тужліва вельмі становілася, калі дзеянне флакончыка сканчалася. Я спрабаваў перабіць гэта віном, гарэлкай, але нічога не атрымалася. Я ад гарэлкі ўжо нічога не меў, яна была для мяне проста як горкая вада: ні «прыходу», ні «сыходу». Нічога, акрамя горычы ў роце. Аднойчы я зразумеў, што ад усяго гэтага ў адзін цудоўны дзень магу заснуць і не прачнуцца...»



У адным з мінскіх двароў.

### Валакардзін і карвалол ужо не выкарыстоўваюцца

Тое, што сёння ў нашых аптэках можна свабодна, без рэцэпта набыць любую спіртавую настойку, **загадчык 21-га наркалагічнага рэабілітацыйнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Уладзімір ІВАНОЎ** называе сур'ёзнай праблемай.

— За мяжой такіх спіртавых настоек няма наогул, — кажа спецыяліст. — На Захадзе пануюць каноны доказнай медыцыны, і ў аптэчныя сеткі трапляюць толькі лекі з доказанай эфектыўнасцю. Многія спіртавыя настойкі часова здымаюць непрыемныя сімптомы менавіта за кошт наяўнасці ў іх алкаголю. Але гэта не лячэнне хваробы...

Што рабіць? «Можна ў выглядзе таблетак гэтыя лекі выпускаць, — упэўнены Уладзімір Іваноў. — Напрыклад, у нас у аптэках маюцца настойка валяр'яны на спірце і карычневыя таблеткі валяр'яны, якія дзейнічаюць не горш за настойку. У наяўнасці спірту там няма неабходнасці. Таму трэба мяняць лекавыя формы — адыходзіць ад прымянення спірту».

А яшчэ ў нашых аптэках можна свабодна набыць валакардзін, карвалол і іх аналагі. Гэтыя прэпараты людзі прымаюць ужо не таму, што ў іх ёсць алкаголь, а таму, што там ёсць фенабарбітал (іншая назва — люмінал). Прычым у адным флакончыку, па словах нарколагаў, знаходзіцца 17 сутачных доз гэтага моцнадзейнага псіхатропнага рэчыва. І яго можна атрымаць без рэцэпта, фактычна ў неабмежаванай колькасці.

Пры гэтым фенабарбітал — не толькі псіхатропны, але і наркатычны прэпарат, які ўваходзіць у пералік наркатычных прэпаратаў у любой краіне, у тым ліку і нашай. Ён вельмі хутка выклікае прывыканне і залежнасць — непараўнальна хутчэй, чым алкаголь. Калі вы паспрабуеце ўвезці карвалол у ЕС, напрыклад у Літву, і яго ў вас выявяць, то вас абвінавацяць у распаўсюджванні наркотыкаў.

Наогул, як кажуць спецыялісты, гэтае рэчыва пачалі выкарыстоўваць у 1906 годзе як сродак супраць трывогі, а таксама заспакаяльны і снатворны. Але потым былі створаны значна больш эфектыўныя і пры гэтым бяспечныя прэпараты, якія выціснулі фенабарбітал. У Еўропе яго перасталі выкарыстоўваць на пачатку 60-х гадоў, і цяпер у многіх краінах фенабарбітал забаронены.

У Савецкім Саюзе, верагодна, праз некаторую ізаляцыю і шматгадовыя звычкі і традыцыі, фенабарбітал «затрымаўся». І да гэтага часу ва ўсіх постсавецкіх краінах, за выключэннем Прыбалтыкі, яго ўжываюць. У нас і цяпер многія людзі баяцца звяртацца да псіхіятра. Таму некаторыя з тых, што пакутуюць на трывожныя расстройствы і парушэнні сну, у якасці самалячэння карыстаюцца прэпаратамі з фенабарбіталам. Яны танныя, агульнадаступныя, прадаюцца без рэцэпта.

— Я хачу, каб людзі разумелі, што валакардзін і карвалол — гэта сродкі, якія адышлі ў мінулае і не выкарыстоўваюцца ўжо нідзе ў свеце, таму што негатыўных наступстваў ад іх прыёму значна больш, чым пазітыўных, — кажа нарколаг. — Так, станоўчыя моманты відаць адразу — чалавек прыняў прэпарат і праз 10 хвілін супакоіўся... Але негатыўныя наступствы застануцца з ім на гады. У яго ўзнікне прывыканне да прэпарата і будуць патрэбны большыя дозы — ужо не 15-20 кропель, а 50, а то і лыжка, таму што ранейшая доза не дзейнічае. Ён стане залежным ад прэпарата. У пажылых людзей валакардзін, карвалол і іх аналагі з часам выклікаюць цяжкія пашкоджанні галаўнога мозга з парушэннем памяці, інтэлектуальных функцый, ажно да дэменцыі (старэчай прыдуркаватасці), таму што яны досыць таксічныя. Фенабарбітал дзесяцігоддзямі выкарыстоўваўся для лячэння хворых на эпілепсію, таму спецыялістам добра вядомыя наступствы яго прымянення.

**Да нас ужо з раніцы выстройваюцца чэргі восьтакіх пастаянных «кліентаў», што пакутуюць ад «смагі», — уздыхае фармацэўт. — Купляюць усё запар, абы спірт у рэцэптуры прысутнічаў.**

Вытворцы гэтых лекаў атрымліваюць прыбытак ад іх продажу. А вось эканамічныя страты ад іх прыёму пакрывае дзяржава. Таму што мноства людзей ідуць потым лячыцца ў дзяржаўныя бальніцы ад наступстваў сістэматычнага ўжывання фенабарбіталу — полінеўрытаў, дэменцыі, розных захворванняў унутраных органаў. А млявасць, санлівасць за рулём на фоне прыёму гэтых прэпаратаў, якая можа прывесці да трагедый? Пажылыя людзі, якія прымаюць валакардзін і карвалол, часцей атрымліваюць пераломы шыйкі сцягна і інш. Хто потым аплачвае іх лячэнне? Дзяржава. Але тут не толькі эканамічныя страты, але і зламаныя, трагічныя лёсы, і гэта таксама варта было б улічваць.

**Святлана БУСЬКО,**
*busko@zviazda.by*

**МЕРКАВАННЕ**

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Алена ШАМАЛЬ:**

**Калі гаварыць пра лекавыя настойкі, якія змяшчаюць 76-працэнтны спірт, то іх не так складана развесці да патрэбнага аб'ёму і атрымаць спіртавы напой. У прынцыпе, гэта нават не лекавыя прэпараты, а біялагічна актыўныя дабаўкі на спірце. І, улічваючы тое, што іх могуць выкарыстоўваць людзі з алкагольнай залежнасцю, некаторыя краіны перасталі выпускаць падобныя прэпараты, у іншых краінах іх адпускаюць толькі па рэцэпце.**

**Лічу, што надышоў час падумаць аб гэтым і ў Беларусі. Увогуле, праблема алкагалізму, на мой погляд, патрабуе комплекснага падыходу. І ў тым ліку было б карысна абмежаваць і свабодны продаж аптэчных прэпаратаў на спірце.**

■ Трагедыя

## «БЯСПРАЎНІК» ЗАБІЎ ПЯЦЯРЫХ?

**Страшэнная аўтамабільная аварыя адбылася пазаўчора ўвечары ў Докшыцкім раёне. З шасці пацярпелых толькі адзін чалавек застаўся жывым — гэта дзевяцігадовая дзяўчынка, якая цяпер знаходзіцца ў Докшыцкай цэнтральнай раённай бальніцы ў надзвычай цяжкім стане. Пра ДТЗ паведамілі ў аддзеле агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама.**

Само здарэнне адбылося прыкладна а 22-й гадзіне на 108-м кіламетры трасы Мінск — Віцебск непадалёк ад вёскі Маргавіца. Як паведамляе **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта па Віцебскай вобласці Святлана САХАРАВА**, аўтамабіль Audi 80, што рухаўся з Мінска ў бок Лепеля, выехаў на сустрэчную паласу, дзе сутыкнуўся з Ford Mondeo, якім кіраваў 51-гадовы грамадзянін Расійскай Федэрацыі, жыхар Санкт-Пецярбурга. У выніку лабавога сутыкнення ўсе чацвёра пасажыраў Audi — жыхары Віцебскай вобласці, а таксама кіроўца Ford загінулі на месцы. Дачка апошняга з цяжкімі траўмамі дастаўлена ў рэанімацыю. Цяпер супрацоўнікі Следчага камітэта разам са спецыялістамі Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз высвятляюць абставіны здарэння, шукаюць сведкаў ДТЗ.



Па папярэдняй інфармацыі, якую «Звяздзе» паведаміла **старшы інспектар па асаблівых даручэннях упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі Ганна БАНАДЫК**, за рулём Audi знаходзіўся 37-гадовы мужчына, якога летась ужо затрымлівалі за ваджэнне ў нецвярозым стане і пазбаўлялі правоў. Да адказнасці за правапарушэнні, учыненыя ў стане ап'янення, у розны час прыцягваліся яшчэ двое з пасажыраў іншамаркі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

## Калонія, канфіскацыя, лячэнне...

**Судом Гродзенскага раёна пакараны мужчына, які стаў вінаўнікам ДТЗ у нецвярозым стане.**

Паводле інфармацыі Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі, вечарам 39-гадовы М. ехаў дахаты ад знаёмай з пасёлка Пагранічны Бераставіцкага раёна, ужыўшы перад гэтым спіртное — гарэлку і сідр. У вёсцы Гібулічы аўтамабіль «Фольксваген-Шаран», які імчаў з вялікай хуткасцю, спыніў інспектар ДАІ. Аднак экстраннае тармажэнне не атрымалася безаварыйным: машына наскочыла на «Форд», які стаяў на ўзбочыне. Як засведчыла экспертыза, колькасць алкаголю ў арганізме вінойніка аварыі перавышала максімальна дапушчальную амаль у 11 разоў.

Суд прызнаў у дзеяннях нецвярозага кіроўцы наяўнасць рэцыдыву. М. 11 разоў затрымліваўся п'яным і тройчы за кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане прыцягваўся да крымінальнай адказнасці, апошні раз — у 2012 годзе. І зноў ухіліўся ад выканання прысуду, сеўшы за руль, калі яшчэ не скончыўся тэрмін забароны на кіраванне аўтамабілем. У выніку яго канфіскацыйнай пакаранне не абмяжавалася. М. накіраваны на год у папраўчую калонію агульнага рэжыму, на 5 гадоў пазбаўлены права на кіраванне транспартнымі сродкамі і, акрамя таго, пройдзе прымусовае лячэнне ад хранічнага алкагалізму.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

ЗВЯЗДА. Наперад у мінулае. Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# ВЫВЕДЗЬ МЯНЕ З ЗЯЛЁНАГА ГАЮ, БО САМА Я ДАРОЖКІ НЕ ЗНАЮ...

**Якія песні спяваць, збіраючы грыбы і ягады?**

**Калектыў «Дубравіца» з вёскі Рычоў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ўвесну 2013 года ўжо быў героем адной з праграм праекта «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3». Тады вынікам паездкі сталі запісы многіх мясцовых аўтэнтычных песень і наноўператвораная «Вішанька-чарэшанька», выкананая гуртом разам з Галінай Шышковай. Але вяртацца туды, дзе спадабалася, дзе яшчэ чакаюць багатыя скарбы фальклору, ніколі не шкодзіць. Тым больш улетку, калі ў лясах мноства грыбоў і ягад, а ў Рычове ведаюць шмат адметных песень, якія дапамагаюць іх збіраць.**
**Таму наша карэспандэнтка разам з камандай праграмы «Наперад у мінулае» зноў накіравалася на Палессе.**
**Тут нас чакае новая сустрэча з «Дубравіцай», знаёмства з выдатнай гаспадыняй Ганнай Бурак і пачастунак у выглядзе свежага каравая. Са старажытнай палескай тэхналогіяй выпечкі здобнага хлеба гледачы тэлеканала «Беларусь 3» змогуць пазнаёміцца 31 ліпеня, а чытачы «Звязды» — ужо сёння.**



Гурт «Дубравіца».

## Лірыка ў лесе

Рычоў — вялікая палеская вёска з доўгімі вуліцамі, рэчкай непадалёк. Тут згадваюцца мележаўскія Курані, тут жывуць людзі з асаблівым светаглядам. Вось і ўдзельнікі «Дубравіцы», здаецца, ніколі не сумуюць, увесь час жартуюць паміж сабой, па-добраму адзначаючы адметныя рысы асобы фактычна кожнага. Яны і сёння па-заліхвацку танчаць, спяваюць вясёлыя прыпеўкі, некаторыя з якіх — уласнага аўтарства.



Удзельнікі гурта «Дубравіца» любяць пажартаваць.

Гісторыя народнага фальклорнага ансамбля «Дубравіца» Рычоўскага цэнтра традыцыйнай культуры налічвае ўжо больш за шэсць з паловай дзесяцігоддзяў. Гурт быў утвораны ў 1950 годзе настаўнікам мясцовай школы Васілём Лукашэвічам, а такую назву атрымаў, бо вёска Рычоў размяшчаецца каля дубровы, што ўздоўж берага ракі Сцвіга.

**«Прыгожыя караваі пяклі на святы — Вялікдзень, Тройцу, іх таксама гатавалі на вяселлі».**

Сёння «Дубравіцай» кіруе Ганна Бурак, гурт прымае актыўны ўдзел у мясцовых і рэспубліканскіх святах, фестывалях. Яго рэпертуар адметны. Ва ўнікальнай палескай манеры ў выкананні калектыву можна пачуць як традыцыйныя песні, што спяваюцца на святы каляндарнага цыкла (калядныя, веснавыя), так і сямейна-абрадавыя. Асабліва багата жанчыны і мужчыны з калектыву ведаюць песень вясельных. З радасцю заспявае «Дубравіца» і пазаабрадавыя песні — пра няшчаснае каханне ці, наадварот, пра ганарлівых аптымістычных дзяўчат, здольных перажыць любое расстанне. Напрыклад, песня «Гурочкі»:

*Посею гурочкі блізка над водою*
*Сама буду паліваці дробнаю*
*слезою.*
*Ой, растуць гурочкі —*
*шырокі лісточкі.*
*Не бачыла міленькага*
*чатыры годочкі.*

Гэтая песня распавядае гісторыю няшчаснага кахання дзяўчыны. Яна спачатку пабаялася прывітацца з каханым пры бацьках, бо не «пасмела сказаць здраствуй», каб маці і бацька не насварыліся. Ды і каханы аказаўся падманшчыкам. Спачатку сказаў, што будзе любіць, а «цяпер смяецца» і «не гляне».

А вось крыху іншая гісторыя з сумнай назвай «Ой, жалю, мой жалю...» Песня расказвае пра каханне дзяўчыны і казака. Дзяўчына была згодная ахвяраваць для яго сваёй маладосцю, але:

*Любіў козак дзеўку,*
*цяпер покідае.*

Добра, што песня мае досыць аптымістычнае завяршэнне і дае надзею на новае каханне:

*Нехай покідае, я плакаць*
*не буду,*
*Я дзеўка молода, без пары*
*не буду.*

У рэпертуары «Дубравіцы» — цэлы пласт адметных лесавых песень. Іх жанчыны выконвалі (і сёння спяваюць) падчас збору грыбоў, ягад у лесе. Адны з іх — сумныя і тужлівыя, гавораць пра няшчасную долю жонкі ў чужой старонцы, далёка ад роднага дома і бацькоўскай сям'і:

*Ой, выйду я на вуліцу погуляць,*
*На вуліцы ўсёй трава-мурова.*
*Дзе ні гляну — то чужа*
*сторона...*

Іншыя ж, наадварот, рытмічныя: такім завадным рытмам яны мусяць спрыяць плённай працы і дапамагаць хутчэй напаўняць кошыкі. Нават сюжэты «лясныя» маюць:

*Ды по грыбы ходзіла*
*У зеленому гаю заблудзіла.*
*Да й прыбіла к зеленому дубу*
*Ой, я тута начаваці буду.*

Але не хвалюйцеся, гісторыя мае добры фінал. Дзяўчына сустракае хлопца, які і выведзе яе з лесу.

## Запрашаем на каравай

**Кіраўніка калектыва «Дубравіца» Ганну БУРАК** у вёсцы ведаюць не толькі як выдатную спявачку і танцорку, але і як добрую гаспадыню, таленавітую кухарку. Яе святочныя караваі вядомыя ва ўсёй ваколіцы.

— Дочкі традыцыйна вучацца гатаваць з маці. Вось і мяне мама навучыла пячы караваі́ (*у Рычове вымаўляюць гэта слова з націскам на апошні склад.* — **Аўт.**). Праўда, яна рабіла іх крыху іншымі, без упрыгажэнняў, гэтаму я ўжо сама навучылася. Заўважала, якія кветачкі, закручаныя коскі на крамных булачках, а дома старалася паўтарыць. Паступова стала выдатна атрымлівацца, — кажа Ганна Мікалаеўна.



На пчальніку Юрыя Рыдзецкага можна пабачыць сучасныя вуллі і старажытныя борці.

Такія караваі ў Рычове штодзень не пяклі. Гэтая справа патрабуе шмат часу і грашовых выдаткаў.

— Будны дзень — будная ежа, таму прыгожыя караваі пяклі на святы — Вялікдзень, Тройцу, іх таксама гатавалі на вяселлі, — тлумачыць гаспадыня. На яе памяці — шмат вясковых свят, сама Ганна Бурак жартуе, што са сваімі караваямі палову вёскі ажаніла і замуж выдала, многія з тагачасных жаніхоў і нявест ужо і ўнукаў маюць. Сёння ж маладыя не надта хочуць прытрымлівацца колішніх абрадаў, таму і пірагамі не надта цікавяцца.

Гаспадыня падзялілася рэцэптам сваёй фірменнай стравы. Каб спячы такі прыгожы і смачны каравай, які атрымаўся ў Ганны Мікалаеўны, спатрэбіцца: 1 літр малака, 4 яйкі, 100 грамаў свежых дражджэй, 8 лыжак цукру, 12 лыжак алею і трохлітровы слоік мукі. Цеста замешваецца да таго часу, пакуль яно не будзе адставаць ад рукі.

— Звычайна пірог пячэцца суткі. З раніцы цеста рашчыняюць, а на наступную раніцу пякуць. Гэта ж здобны хлеб — ён робіцца хутчэй, за некалькі гадзін. Рошчына падыходзіць прыкладна за 2 гадзіны, потым цеста выкладваецца ў форму і ставіцца ў разагрэтую печ, — дадае Ганна Бурак.

Раней цеста рашчынялі ў спецыяльнай драўлянай дзяжы, а пяклі ў печы на лапаце, на капусным лісце — каб хлеб быў чысты. Сёння ж у гаспадыні ёсць спецыяльная форма для пірагоў, ды і ўпрыгожанні яна робіць адметныя. З трох доўгіх кавалкаў цеста сплятае касу — атрымліваецца каласок, а каб атрымалася кветачка, трэба цеста парэзаць... нажніцамі.

## Прадоўжыць справу продкаў

Калі трапляеш на гэтую сядзібу, здаецца, існуеш адразу ў некалькіх часавых вымярэннях. Сёння і ўчора, сучасная тэхніка і традыцыйныя рамёствы арганічна ўжываюцца побач на невялічкай тэрыторыі, а ўсе ўпрыгажэнні, нягледзячы на тое, што нядаўна зробленыя, выглядаюць старажытнымі. **Мясцовы жыхар Юрый РЫДЗЕЦКІ** не забываецца на запаветы продкаў. У Рычове жылі яго бацькі, дзяды і прадзеды, таму мужчына сёння не проста ўладкоўвае бацькоўскую сядзібу. Сам навучыўся плесці з лазы, выразае з дрэва.

**Гурт «Дубравіца» быў утвораны ў 1950 годзе, а такую назву атрымаў, бо вёска Рычоў размяшчаецца каля дубровы.**

— Памятаю, што наша сядзіба і колісь выглядала неяк падобна, вакол хаты стаялі плятні з лазы. Таму і я працягваю справу бацькі і дзеда. Вырашыў аднавіць сядзібу, зрабіць усё з дрэва, — адзначае Юрый Афанасьевіч.

Гаспадар прызнаўся, што з жалезам працаваць не хоча, больш падабаецца рабіць упрыгажэнні з дрэва, як у старажытнасці. У яго прадзеда тут быў свой млын, а дзед і бацька захапляліся пчалярствам. Таму і Юрый Рыдзецкі — вядомы ў наваколлі пчаляр. Цікава, што ёсць на яго пчальніку як сучасныя рамачныя вуллі, так і борці, выробленыя па традыцыйнай тэхналогіі са ствалоў дрэва. І гэта не аграсядзіба для турыстаў, не сховішча дзіваў, а звычайны дом для сям'і, утульны і цёплы. Сюды з задавальненнем прыязджаюць дзеці гаспадара, якія жывуць далёка ад дома. Сын уладкаваўся ў Полацку, а дачка — у расійскай Калузе.

— Мой бацька ўвесь час нешта рабіў па гаспадарцы. Не мог проста так сядзець. Вось і я не магу без працы, — кажа Юрый Рыдзецкі.

Здаецца, што менавіта ў гэтых словах хаваецца спрадвечная мудрасць палешука ці, шырэй, усіх беларусаў. Клопат пра ўласны дом і сям'ю мусіць стаць галоўнай справай у жыцці гаспадара і гаспадыні. І хай у гэтым клопаце будзе больш спрадвечных рыс, запаветаў нашых продкаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

## Серада, 27 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Гранчанка».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.15 Серыял «Ліст чакання».**
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Простае жыццё».**
**17.35 Дэтэктыў «Апошняя сустрэча».**
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Дзявочае паляванне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.10, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**10.15** Зразумець і абясшкодзіць.
**10.45, 17.10** «Анлайн». Скетчкам.
**11.15, 17.45 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.30, 18.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.25, 19.55 Серыял «Кухня».**
**14.30** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10, 22.15 Дэтэктыў «Падмані мяне 2».**
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.10 Серыял «Чужаземка».**

### Беларусь 3

**8.00, 11.30, 18.30, 21.05** «Калейдаскоп».
**8.15, 11.45** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.20, 17.00 «Нестар Бурма». Серыял, заключная серыя.**
**9.55, 19.30 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Дэтэктыў.**
**11.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці музыканта, артыста, спевака Анатоля Шчарбакова.
**11.50** «Святыні Беларусі». Свята-Мікалаеўская гарнізонная царква (г. Брэст).
**12.20 «Прыватны візіт у нямецкую клініку». Маст. фільм.**
**14.30** «Прытулак тытанаў». Навукова-папулярны фільм.
**15.10 «Прышпіліце рамяні». Меладрама.**
**18.50, 21.20** «Крах аперацыі «Мангуста». Фільм другі. Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**22.00 «Бесаме». Драма.**

### Беларусь 5

**7.50, 19.20, 23.30** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Спорт-кадр.
**8.30, 13.40, 19.30** Тэніс. Турнір WTA. Манрэаль.
**10.35** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод юніёраў. Вячэрняя сесія.
**17.55** «Жанчыны і спорт». Аляксандра Герасіменя.
**18.25** «Адзін дзень на шляху да Алімпу».
**19.00** Козел пра футбол.
**23.40** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.20** «Адваротны адлік». «Паляўнічыя і ведзьмы. Рады праклён».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Доўгі шлях дадому».**
**22.55** «Давай пажэнімся!»
**23.50 Маст. фільм «У пошуках Рычарда».**



**1.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30. 23.00** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30** «Вадзіць па-руску».
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50 «Следакі». Серыял.**
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.50 «Меч». Заключныя серыі.**

### МІР

**6.00** М/ф.
**6.20, 23.45 Маст. фільм «Рам і Лакхан».**
**9.00 Серыял «Галубка».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Паляванне на ізюбра».**
**16.20** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20, 3.05 Серыял «Невідзімкі».**
**22.00 Маст. фільм «Парадыз».**
**2.35** Дак. серыял «Іншы свет».
**4.40 Маст. фільм «Падкідыш».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.15 Серыял «Жыццё і лёс».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.50 Серыял «Ракавая спадчына».**
**21.55, 23.10 Серыял «Мацней лёсу».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**14.20 Серыял «Апергрупа».**
**15.10, 16.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**19.40 Серыял «Дзікі».**
**23.05 Серыял «Наркатрафік».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.30 Серыял «Уцёкі».**
**8.50, 17.35 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**9.40 Серыял «На дарозе».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Маст. фільм «Смерч».**
**12.45** «Кінаблакнот».
**12.55 Серыял «Каўчэг».**
**14.15, 15.55, 18.40, 19.15, 20.55** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Вядзьмарка».**
**16.15 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.45** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Паветраны маршал».**



**22.50 Серыял «Спартак», «Вайна праклятых».**
**23.45** «Свой фермер. Другі сезон».

### ВТБ

**6.00, 17.00, 4.00** «Лаві момант».
**6.30, 17.30, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00, 13.10, 23.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.30** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Гэта каханне».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Сям'я 3D».
**11.30** Прыгоды «Паляўнічыя».
**14.00, 1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**21.10** Меладрама «128 удараў сэрца ў хвіліну».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50, 3.00** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** Дзень памяці М.Ю. Лермантава. «Герой нашага часу». «Максім Максімыч». «Тамань». Маст. фільм.
**11.35, 12.20, 13.10, 13.40, 14.50, 15.35, 16.15, 17.15, 18.00, 18.30, 19.25, 20.25, 21.20, 21.50, 22.30, 23.25, 1.35, 1.50** Праект «Лермантаў».
**11.40** «Аляксей Ляпуноў». Асоба дваранскага паходжання». Дак. фільм.
**12.25, 20.30** «Сага аб Фарсайтах». Серыял.
**13.15** «Эрмітаж».
**13.45, 23.50** «Капітан Нэма». Маст. фільм.
**15.10, 21.25** «Рэгтайм, або Разарваны час».
**15.40** «Любоў Сакалова. Свая тэма». Дак. фільм
**16.20, 22.35** «Ваша ўнутраная рыба». Дак. серыял.
**17.20** Да 125-годдзя з дня нараджэння Сяргея Пракоф'ева. Аліса Вайлерштайн, Паава Ярві і Аркестр дэ Пары.
**18.05** «Доктар Вераб'ёў. Перачытваючы аўтабіяграфію». Дак. серыял.
**18.35** «Вясёлы жанр нявясёлага часу». Дак. серыял.
**19.15** «Дабранач, малыя!»
**19.45** 80 гадоў з дня нараджэння артыста. «Марыс Ліепа. ...Я хачу танцаваць сто гадоў». Дак. фільм.
**21.55** Улада факта. «Кансерватызм або інерцыя. Расія ў эпоху Аляксандра ІІІ».
**23.45** Мастсавет.
**0.55** «Міхаіл Кананаў». Дак. фільм.
**1.45** «Антоніа Сальеры». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.15** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Тбілісі-80». 2005 год.
**7.05, 8.30, 9.40, 11.00, 12.45, 14.15, 15.40, 17.00, 18.50, 20.35, 21.40, 23.00, 1.15, 2.40, 5.10** Музычная настальгія.
**7.25** Маст. фільм «Успамін».
**8.45, 14.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1976 год.
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Успаміны пра Уладзіміра Высоцкага.
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім. «Вініл па-савецку». 2007 год.
**13.00** Маст. фільм «Марына».
**16.00** «Народжаныя ў СССР». Сяргей Чыгракоў. 2006 год.
**18.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. Аляксей Івашчанка. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Пачатак».
**20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1977 год.
**22.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Групы «Крематорий» і «Агата Кристи». 2008 год.
**0.00** «Зямля—Паветра». Дэцл. 2003 год.
**2.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 2004 год.
**3.00** Маст. фільм «Кароль Лір».

### EuroSport 1

**4.00, 8.30, 12.30, 15.15, 20.00, 0.05** Веласпорт. Тур Валоніі.
**5.30, 13.15, 1.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**6.30, 14.15, 18.45, 23.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Найлепшае.
**7.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы сярод юнакоў (U-19). Фінал.
**9.00, 21.00, 2.30** Снукер. World Open.
**12.00** «Дух парусная спорту».
**18.15** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**19.45** Веласпорт. Тур Валоніі. Пяты этап.
**20.50** «Дарога да золата».

### Камедыя

**0.45** «Кур'ер». Камедыя.
**2.30** «Патрабуюцца карэктныя паводзіны». Камедыя.
**4.10** «Законы прывабнасці». Меладрама.
**5.45** «Прышэльцы». Камедыя.
**7.40** «Каманда мары». Камедыя.
**9.20** «Домік у сэрцы». Меладрама.
**11.00** «Гіганцік». Камедыя.
**12.45** «Пакетная здзелка». Серыял.
**14.00, 14.50, 15.35** «Паміж намі». Скетчкам.
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** «Мытня дае дабро». Камедыя.
**18.00** «М + Ж». Камедыя.
**19.30** «Прышэльцы 2: калідоры часу». Камедыя.
**21.35** «Як скрасці брыльянт». Камедыя.
**23.15** «Вялікі Джым». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.10** «Доктар І...»
**7.40, 18.55, 2.10** «Гісторыя кахання». Серыял.
**9.30, 3.55** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.25, 4.40** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.25** «Сляпая».
**12.25** «Варажбітка».
**13.30** «Тайныя знакі».
**14.30** «Шафа».
**15.20** «Здзелка».
**15.55** «Жанна, пажаніл».
**16.55, 22.00** «Рэвізора».
**17.55** «Тайны следства». Серыял.
**21.00, 1.15** «Блокбастары».
**23.05, 5.30** «Зоркі і містыка».
**23.45** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.10, 14.10** Меладрама «Крок наперад: усё ці нічога».
**8.10, 4.10** Трылер «Самы небяспечны чалавек».
**10.15, 2.10** Меладрама «Джэйн Эйр».
**12.20** Трылер «Без кампрамісаў».
**16.10** Камедыя «Вялікі тата».
**17.50** Драма «Непакораны».
**20.10** Трылер «Прыстанак праклятых».
**22.10** Меладрама «Яна».
**0.20** Меладрама «Шоўк».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.10** Драма «Франц + Паліна».
**8.30, 2.20** Меладрама «Статус: свабодны».
**10.20, 4.20** Драма «Чыстая перамога».
**12.20** Драма «Першы настаўнік».
**14.20** Меладрама «Восьмае сакавіка».
**16.20** Камедыя «Алімпійская вёска».
**20.20** Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
**22.20** Драма «Жыць».
**0.30** Драма «Сава Марозаў».

### National Geographic

**6.00, 18.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 9.55, 13.10, 14.45, 20.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 10.45, 17.10, 21.00, 0.55, 4.00** Незвычайныя промыслы.
**9.10, 14.00, 19.25** Чалавек супраць YouTube.
**11.35, 0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**12.30** Золата Юкана.
**15.30** У пошуках плямёнаў паляўнічых.
**16.20** Інстынкт выжывання.
**22.35** 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё.
**23.20, 2.25** Рэальнасць ці фантастыка?

### Discovery

**8.00** Звышчалавечая навука.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Гаражнае золата.
**11.00, 7.10** Рыбацкія легенды.
**12.00** Поўны фарсаж.
**13.00, 6.20** Як устроены Сусвет.
**15.00, 5.30** Калекцыянеры аўто.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Стальныя хлопцы.
**19.00** Хуткія і гучныя.
**20.00** У пагоні за класікай.
**22.00** Іржавая імперыя.
**23.00** Бітвы за кантэйнеры.
**0.00** Паляўнічыя на склады.
**1.00** Склады.
**2.00, 4.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** Першая палова тыдня з найбольшай верагоднасцю пройдзе ў рабочай мітусні і хатніх клопатах. Пачынаючы з чацвярга, давядзецца працаваць упарта і шмат, сістэматызуючы велізарную колькасць назапашанага матэрыялу. Гэты працэс, не вельмі цікавы збоку, для вас акажацца захапляльным. Яго вынік будзе вельмі нечаканым і прывядзе да з'яўлення прывабных перспектыў, звязаных з кар'ерным ростам. Можаце апынуцца перад выбарам: паступіць па загадзе сэрца (гэта значыць зрабіць тое, што хочацца) ці так, як вам падкажа сумленне і розум.

**ЦЯЛЕЦ.** Новыя справы, праекты і прапановы падаспеюць своечасова, спрыяльны час для ветру канструктыўных перамен. Не выключана, што ў вас з'явіцца магчымасць павысіць свой сацыяльны статус. У аўторак не варта прымаць важнага рашэння ў адзіночку, парайцеся з блізкімі. У чацвер варта прааналізаваць адносіны з навакольнымі, інакш яны паграджаюць зайсці ў тупік. Калі ўсё выглядае не так, як вам таго б хацелася, даруйце старыя крыўды і падумайце аб новых сумесных справах.

**БЛІЗНЯТЫ.** Начальства вас цэніць, ніякіх праблем у зносінах з калегамі зоркі не прагназуюць. У другой палове тыдня ў вас адкрыюцца новыя перспектывы на працы. Рэалізацыя даўніх ідэй здольная прынесці маральнае і матэрыяльнае задавальненне. У пятніцу варта ўжыць творчы падыход, нестандартны погляд на рэчы і вастрыню мыслення. У выхадныя шмат часу прыйдзецца прысвяціць хатнім справам, на паўнавартасны адпачынак можна не разлічваць.

**РАК.** Старайцеся злавіць сваю хвалю і ўтрымлівацца на ёй да таго часу, пакуль вам не стане ясна, куды рухацца далей. Пакуль не варта вылучацца на фоне калектыву. Асаблівых дасягненняў на працы не прадбачыцца, трэба будзе проста сумленна працаваць, усё астатняе замрэ, нібы ў чаканні чагосьці. Магчыма, хуткага адпачынку. Каб з чацвярга па нядзелю ў хаце не склалася гнятлівая атмасфера, ад вас асабіста спатрэбіцца максімум такту і дабрыні. У нядзелю атрымаецца вырашыць вялікую частку набалелых праблем.

**ЛЕЎ.** Вам перыядычна давядзецца перарабляць частку спраў, вяртацца да адкладзеных з прычыны непрадбачаных абставінаў. Неабходна сканцэнтравацца, каб накіраваць падзеі ў патрэбнае і выгаднае для вас рэчышча. Паспрабуйце захоўваць лагічную паслядоўнасць у дзеяннях. Далёка не ва ўсім, што будзе адбывацца ў непасрэднай блізкасці ад вас, варта ўдзельнічаць. Другая палова тыдня пройдзе пад эгідай новых пачынанняў і кардынальнай змены напрамку жыцця. У канцы тыдня могуць узнікнуць праблемы з дзецьмі, асабліва дарослымі.

**ДЗЕВА.** Зоркі ўпэўнены: надыходзіць час перамен. Вам паступіць шмат цікавых прапаноў па працы, толькі не варта спяшацца з прыняццем рашэнняў. У такім багацці прывабных перспектыў можна ўпусціць нешта важнае. У зносінах з дзелавымі партнёрамі сачыце за сваімі выказваннямі; пачуўшы крытыку, не спяшайцеся крыўдзіцца, а зрабіце правільныя высновы. У суботу можаце атрымаць цікавую і выгадную прапанову, скарыстацца якой, на жаль, будзе не так проста, як хацелася б.

## Субота, 30 ліпеня

### Беларусь 1

**6.20** Існасць.
**6.50 Меладрама «Райскі куток».**
**8.30** Буйным планам.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10 Серыял «Сваты-4».**
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**11.10** Дача.
**11.40** Нашы.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.05, 15.45 Меладрама «Ключы ад мінулага».**
**15.15** Краіна.
**21.00** Панарама.
**21.40 Трылер «Непадсудныя». 1 — 4-я серыі.**
**1.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.50, 21.05** Тэлебарометр.
**6.55 Серыял «Класная школа».**
**7.20 Серыял «Шчаслівыя разам 2».**
**9.15** «Занадта шмат хвастоў».
**9.50 Серыял «Хто ў доме гаспадар?»**
**11.50** Вяселле без баяна.
**12.25** «Бітва экстрасэнсаў. XII».
**14.40** Капейка ў капейку.
**15.10** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**16.20 Меладрама «Я, зноў я і Ірэн».**



**18.25 Фантастыка «Дзень незалежнасці».**



**21.10 Драма «12 гадоў рабства».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.40, 16.05, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 13.05** «Размаўляем пабеларуску». Тэлевіктарына.
**8.20, 16.20 «Дзелавыя людзі». Камедыя.**
**9.45** «Музыка і фарбы». Музычнае падарожжа па залах Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. Дак. фільм.
**10.10 «Так і будзе». Драма.**
**12.25** «Вялікая Айчынная. Недагаворанае». «Штрафная душа». Дак. фільм.
**13.55** «Час кіно».
**14.05 «Я, бабуля, Іліко і Іларыён». Камедыя.**
**15.35** «Камертон». Салістка аркестра «Тбілісі Біг-Бэнд» Мая Бараташвілі.
**17.40** «Навукаманія».
**18.10 «Пан Валадыёўскі». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.15** «Засакрэчанае каханне. Дуэт салістаў». Дак. фільм.
**22.00 «Варашылаўскі стралок». Драма.**
**23.35** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**6.40, 22.25** PRO спорт. Навіны.
**6.50, 12.40** Тэніс. Турнір WTA. Манрэаль. 1/4 фіналу.
**8.55, 15.25** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету сярод юніёраў і моладзі. Заслаўе.
**14.50, 22.40** «Адзін дзень на шляху да Алімпа».
**18.25** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама» (Брэст).
**20.25** Тэніс. Турнір WTA. Манрэаль. 1/2 фіналу.
**23.15** «Жанчыны і спорт». Алена Амялюсік.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**11.55** «Дачныя феі».
**12.25** «Іна Макарава. Лёс чалавека».
**13.30 Камедыя «Прыгоды Падзінгтана».**
**15.00** «Аляксей Баталаў. «Я не таргуюся з лёсам».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «Удача ў дадатак! З «Еўраоптам».
**18.00** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**18.55** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.35** Міжнародны музычны фестываль «Жара».
**1.00 Маст. фільм «Няма такога бізнесу, як шоу-бізнес».**

### СТБ

**6.00 «Турысты». Серыял.**
**7.20** «Анфас».
**7.35 Меладрама «Дзяўчына з Джэрсі».**
**9.20** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.00** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.45 «Салдаты 12». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 2.00 Маст. фільм «Адзіная».**
**15.25** «Самая карысная праграма».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.35** «Прагнасць».
**20.05** «Нам і не снілася».
**22.35 «Немагчымыя зялёныя вочы». Серыял.**

### МІР

**6.00, 2.20** М/ф.
**8.30** «Медыцынская праўда».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45, 0.50 Маст. фільм «Зайчык».**
**12.25** «Цяжар абеду».
**12.55 Маст. фільм «Мангол».**
**15.10** «Арда».
**16.15 Серыял «Варажба пры свечках».**
**23.05 Маст. фільм «Заза».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.45 Маст. фільм «Ідэальны мужчына».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.15** Да Міжнароднага дня тыгра. «Амурскі тыгр. Шлях да святой гары».
**12.15 Маст. фільм «Раман у пісьмах».**
**14.15** «Асабістае. Максім Аверын».
**15.00 Камедыя «Тры плюс два».**
**16.30 Маст. фільм «Вясковая гісторыя».**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.35** Юбілейны канцэрт Ігара Крутога.
**22.35 Маст. фільм «Апошняя ахвяра Ганны».**

### НТБ—Беларусь

**5.50** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Суджэнцы».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.50** Іх норавы.
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.10** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.10** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў дадатак!»
**14.15, 16.20 Серыял «Новае жыццё сышчыка Гурава. Працяг».**
**18.10** «Следства вялі...»
**19.20** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.10 Серыял «Пёс».**
**23.45 Серыял «ППС».**

### 8 канал

**9.00, 15.45, 19.10, 21.10, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.55 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**10.40** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.50, 15.50, 19.00, 21.00** «Хатняя крама».
**11.05 Серыял «На дарозе».**
**14.35** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Лэдзі — дэтэктыў».**
**17.30 Драма «Дзіяна».**
**19.15 Маст. фільм «Насустрач шторму».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Вяртанне дадому».**

### ВТБ

**6.00, 9.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.30** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**7.45** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30, 12.00** «Ералаш».
**9.00, 13.30, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Хто каго на кухні».
**12.30** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**14.00** «Кіно ў дэталях».
**15.00** Камедыя «Выкрутасы».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**18.30** Серыял «Мамачкі».
**20.30** Баявік «Тэрмінатар 2: судны дзень».
**22.30, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Дзікія гульні».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Ля возера». Маст. фільм.
**13.05** Легендарныя спектаклі Вялікага. Марыс Ліепа, Уладзімір Васільеў, Кацярына Максімава ў балеце «Спартак». Запіс 1970 года.
**15.20** «Марыс Ліепа. ...Я хачу танцаваць сто гадоў». Дак. фільм
**16.05** Да 90-годдзя Іны Макаравай. «Неўзаемнае каханне». Маст. фільм.
**17.30** «Іна Макарава — буйным планам». Творчы вечар у Дзяржаўным тэатры кінаакцёра.
**18.40** Залатая калекцыя «Зіма — Лета».
**21.25** Новае расійскае кіно. «Чалавек ля акна». Маст. фільм.
**23.00** Да 75-годдзя дырыжора. Рыкарда Муці і Венскі філарманічны аркестр.
**0.55** «Вяселле». Маст. фільм.
**1.55** «Шукальнікі». «Загадкавыя дакументы Георгія Гапона».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Яўген Хаўтан. 2008 год.
**6.45, 8.25, 9.40, 11.00, 12.45, 15.40, 17.00, 18.45, 19.50, 23.00, 0.50, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Мужчыны ёсць мужчыны».
**8.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1977 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Радзміла Каракланіч, Аіда Вядзішчава. 2007 год.
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1960. 4-я частка. 2009 год.
**13.00** Маст. фільм «Я вас кахаў...»
**14.30** Маст. фільм «Дзе гэта бачана, дзе гэта чута».
**16.00** «Колба часу» з Дзмітрыем Быкавым. «Самае вядомае, самае скандальнае нефармальнае аб'яднанне ў СССР». 2013 год.
**18.00** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым. «Таленты і іх прыхільнікі». 1993 год.
**19.40** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 1994 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Ішоў сабака па раялі».
**23.20** «Гадзіна пік» з У. Лісцьевым. Клара Новікава. 1994 год.
**0.00** «Сляем, сябры!» з Таццянай Візбар. Аляксей Івашчанка. 2007 год.
**1.10** Маст. фільм «Пачатак».
**4.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Групы «Крематорий» і «Агата Кристи». 2008 год.

### EuroSport 1

**4.00, 21.00, 1.05** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**7.00, 13.00** Велаcпорт. Тур Валоніі.
**8.00, 22.45, 2.30** Снукер. World Open.
**12.00, 15.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Найлепшае.
**14.00** Футбол. Зоркі MLS — «Арсенал» (Англія).
**16.30** Веласпорт. «Класіка. Сан-Себасцьяна».
**18.30** Аўтаспорт. Серыя Blancpain Endurance.

### Камедыя

**0.35** «Прышэльцы». Камедыя.
**2.35** «Прышэльцы 2: калідоры часу». Камедыя.
**4.30** «Паміж намі». Скетчкам.
**4.55** «Вакол свету за 80 дзён». Камедыя.
**7.00** «Каханне — гэта для дваіх». Меладрама.
**8.45** «Усё пуцём!» Камедыя.
**10.30** «Вялікі Джым». Камедыя.
**12.15** «10 дзён каб закахацца». Меладрама.
**14.10** «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам». Камедыя.



**16.00** «Елкі 1914». Камедыя.
**17.55** «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя». Камедыя.
**20.10** «Каханне і іншыя катастрофы». Меладрама.
**21.50** «Каханне без перасадак». Меладрама.
**23.35** «Мытня дае дабро». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.40** «Хронікі маскоўскага побыту».
**10.35** «Доказ віны».
**11.10, 1.45** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**14.50** «Ледніковы перыяд 3». Анімацыйны фільм.
**16.20** «Блокбастары».
**17.25, 4.50** «Алігарх ТБ».
**18.00, 5.15** «Хэлоў, Раша».
**19.00** «Тарас Бульба». Драма.
**21.35** «Ультыматум Борна». Баявік.
**23.45** «Каліфрэнія». Серыял.
**0.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.10, 18.30** Камедыя «Бі і крычы».
**8.10, 4.35** Меладрама «А вось і Полі!»
**10.10, 2.10** Драма «Залатое стагоддзе».
**12.20** Трылер «Выжывуць толькі палюбоўнікі».
**14.30** Драма «Бабёр».
**16.05** Фантастыка «Дывергент».
**20.10** Меладрама «Там, дзе сэрца».
**22.20** Фантастыка «Пасвячоны».
**0.10** Камедыя «Яна яго абажае».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 16.55** Камедыя «Жанчыны супраць мужчын».
**8.05, 2.10** Трылер «Якая бяжыць па хвалях».
**10.25, 4.25** Баявік «Адваротны адлік».
**12.20** Фільм-казка «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
**13.40** Прыгоды «Тайна цёмнага пакоя».
**15.05** Прыгоды «Яраслаў. Тысячу гадоў назад».
**18.25** Драма «Дом ветру».
**20.20** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!»
**22.20** Драма «Духless 2».
**0.20** Меладрама «Яшчэ адзін год».

### National Geographic

**6.00** Суперзбудаванні Трэццяга рэйха.
**6.50, 13.00** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 19.25, 4.30** Космас. Прастора і час.
**8.20** Сапраўдны геній.
**9.10** Золата Юкана.
**9.50** Незвычайныя промыслы.
**11.25, 0.40, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**12.15** Цяжкае золата Аляскі.
**13.50** Больш чым фокусы.
**20.10, 1.25** «Тытанік»: заключнае слова.
**21.40, 2.55, 5.10** Касмічнае падарожжа «Хабла».
**22.10** Рэальнасць ці фантастыка?
**22.35** Зорная размова.
**23.50** Навука будучыні.

### Discovery

**8.00, 0.00** Вулічныя гонкі.
**9.00, 2.00** Выжыванне без купюр.
**10.00** Рачныя монстры.
**11.00, 4.40** Паляўнічыя на склады.
**12.00** Іржавая імперыя.
**13.00** Бітвы за кантэйнеры.
**14.00** Хуткія і гучныя.
**15.00, 2.55, 6.20** У пагоні за класікай.
**16.00, 5.30** Стальныя хлопцы.
**17.00** Дзікая кухня.
**22.00** Інжынерыя немагчымага.
**23.00** Мегаперавозкі.
**1.00** Аляска: апошні рубеж.
**3.50** Аперацыя «Выратаванне дома».
**7.10** Чарнобыль: жыццё пасля.

## ■ У свеце жывёл

# ХІТРЫЯ, АЛЕ ВЕРНЫЯ

**Гэтую птушку лічаць смелай, хітрай, часам назойлівай, а часам і зладзеяватай. З яе вобразам людзі заўсёды звязвалі мноства вясёлых гульняў, пацешак, прыказак і прымавак. Гэта адна з самых вядомых птушак, якія жывуць па суседстве з жыллём чалавека (адсюль яе відавая назва «дамавы»). Гаворка пойдзе пра звычайнага вераб'я.**

Праз тое, што верабей хітры і зладзеяваты, шырокае распаўсюджванне атрымала версія аб паходжанні ў рускай мове слова «воробей» ад словазлучэння «вора — бей!». На самай справе ў славянскіх мовах слова «верабей» мае той жа корань, што і ў слове «буркаваць». Асновай гэтаму дзеяслову, як і дзеяслову «бурчэць», паслужыла слова «ворк», якое не дайшло да нашых дзён. Так гэтую птушку празвалі за пастаяннае цырыканне, якое не змаўкае ні на хвіліну.



Сярэдняя працягласць жыцця вераб'ёў — ад 9 да 21 месяца. Але сустракаліся такія асобіны, якія жылі і па 9-11 гадоў.

Існуе меркаванне, што дамавы верабей як адна з самых блізкіх птушак — суседзяў чалавека, можа выступаць у ролі «біялагічнага індыкатара» і па стане папуляцыі гэтага віду можна меркаваць пра змены ў навакольным асяроддзі.

Быўшы сужыцелем чалавека, верабей рассяліўся па ўсім свеце, яго аднолькава часта можна сустрэць у сельскай і гарадской мясцовасці, у паселішчах Крайняй Поўначы і Сярэдняй Азіі. Зрэшты, у Сярэдняй Азіі ён трымаецца звычайна далей ад чалавека.

У Амерыцы да 60-х гадоў мінулага стагоддзя не было вераб'ёў. Іх завезлі з Англіі для барацьбы з вусенямі.

Цікавы факт: верабей — адналюб, птушкі ў пары верныя адна адной гадамі, а то і ўсё жыццё. Самец, у якога з восені не склалася сям'я або за зіму загінула самка, асуджаны наступны сезон правесці халасцяком. Вядома, такі верабей будзе выкарыстоўваць любую магчымасць схіліць да сумеснага жыцця самотную самку. Аднак гэта няпроста, таму што да пачатку сезона размнажэння самцоў значна больш, чым самак (на сто вераб'іх прыпадае сто пяцьдзесят вераб'ёў).

Сэрца вераб'я б'ецца 600—850 разоў на хвіліну ў стане спакою, а падчас палёту — 1000 удараў.

Большасць прадстаўнікоў сямейства па зямлі пераскоўваюць скачкамі, бо кароткія ногі.

Нармальная тэмпература цела вераб'я — 44 градусы.

Праз асаблівасці будовы вачэй вераб'і бачаць свет у ружовым святле, а ў шыі вераб'я ў два разы больш пазванкоў, чым у жырафа.

Маладых вераб'ёў з іх жоўтай афарбоўкай вакол дзюбы ў народзе называюць «жаўтароцікамі». У гутарковай мове «жаўтароцік» можа азначаць маладога, неспрактыкаванага, наіўнага чалавека.

Народная прыкмета абвяшчае, што калі верабей купаецца ў пяску, то будзе дождж, на самай справе такім чынам птушка пазбаўляецца ад паразітаў і чысціць пёркі.

Вядомыя факты ўстаноўкі помніка вераб'ю, збудаваныя чалавекам у знак падзякі за дапамогу з боку гэтай птушкі ў барацьбе супраць шкодных насякомых. Першы такі манумент быў узведзены ў сярэдзіне XIX стагоддзя ў Бостане ■

■ Ну і ну!

## Хірургі выбралі самы прыгожы жаночы твар

**Медыкі з лонданскага цэнтра пластычнай хірургіі назвалі твар амерыканскай актрысы Эмбер Херд самым прыгожым у свеце. Даследчыкі абапіраліся на методыку камп'ютарнай картаграфіі, паведамляе Daily Mail.**



«Мы распрацавалі найноўшую методыку камп'ютарнай картаграфіі, якая дэманструе змены, якія неабходна ўнесці, каб прапорцыі твару сталі больш правільнымі», — сказала кіраўніца цэнтра доктар Джулiян Дэ Сілва. Адзначаецца, што з дапамогай тэхналогіі атрымалася высветліць, што твар 30-гадовай Херд на 91,85% супадае з прапорцыямі, якія лічацца ідэальнымі па формуле залатога сячэння.

Абапіраючыся на методыку, хірургі таксама палічылі ідэальнымі рысы твараў і іншых славутасцяў. У іх лік патрапілі бровы Кім Кардаш'ян, вочы актрысы Скарлет Ёхансан, форма твару спявачкі Рыяны, вусны манекеншчыцы Эмілі Ратакоўскі і лоб супермадэлі Кейт Мос. Залатое сячэнне (залатая прапорцыя) вядома яшчэ з «Пачаткаў» Еўкліда, што пабачылі свет больш за 2300 гадоў таму. Матэматычна яно ўяўляе сабой ірацыянальную лічбу, прыкладна роўную 1,618. У працэнтным акругленым значэнні залатое сячэнне — гэта дзяленне якой-небудзь велічыні ў суадносінах 62 да 38%.



У твары чалавека можна прасачыць прапорцыі, падначаленыя залатому сячэнню. Лічыцца, што чым больш суадносін у гэтых суразмернасцях, тым больш прывабным з'яўляецца знешні выгляд для навакольных.

## Разгадала «крыжаванку» на... 116 тысяч долараў

**Пажылая наведвальніца Новага музея мастацтва і дызайну ў Нюрнбергу прыняла твор мастацтва за звычайную крыжаванку і запоўніла яго шарыкавай ручкай, паведамляе ABC News.**

91-гадовая жанчына была на экскурсіі разам з групай, калі ўбачыла надпіс «Устаўце словы» побач з арт-аб'ектам. Бабулька патлумачыла паліцэйскім, якія прыбылі на месца інцыдэнту, што палічыла іх кіраўніцтвам да дзеяння, таму і разгадала «крыжаванку». Праца дацкага мастака-авангардыста Артура Кепке, створаная ў сярэдзіне 1960-х гадоў, была арандаваная музеем у прыватнага калекцыянера. Яе кошт ацэньваецца ў 116 тысяч долараў. Дырэктар музея Эва Краўзэ паведаміла, што шкода будзе пакрыта. Паводле яе слоў, галерэі прыйшлося выклікаць паліцыю толькі для афармлення страхавога выпадку. «Мы перададзім жанчыне, што калекцыянер успрыняў нанесеную шкоду з гумарам і не стаў патрабаваць з пенсіянеркі ніякіх кампенсацый, так што яна можа спаць спакойна», — дадала Краўзэ. Крыху падобны выпадак здарыўся ў адной з арт-галерэй у ЗША — у маі наведвальнікі аднаго з музеяў Каліфорніі прынялі за твор сучаснага мастацтва акуляры на падлозе, спецыяльна пакінутыя там падлеткам ■

## Нядзеля, 31 ліпеня

### Беларусь 1

**6.50** Меладрама «Ты будзеш маёй».
**8.30** Народная раніца.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40 Серыял «Сваты-5».**
**10.50** «50 рэцэптаў першага».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Райскі куток».**
**14.25** Каробка перадач.
**15.15** Твой горад.
**15.30** «Вакол планеты».
**16.15** Зона Х. Вынікі тыдня.
**16.45** Тайны следства.
**17.15** Меладрама «Адзінокія сэрцы».
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10 Трылер «Непадсудныя». 5 — 8-я серыі.**

### Беларусь 2

**7.05, 21.10** Тэлебарометр.
**7.10 Серыял «Класная школа».**
**8.10 Серыял «Хто ў доме гаспадар?»**
**10.15** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
**11.20** Ваша лато, Пяцёрачка.
**11.50** Зразумец і абясшкодзіць.
**12.30** Я хачу гэта ўбачыць.
**13.05 Серыял «Шчаслівыя разам 2».**
**14.55** М/ф «Вэліянт».
**16.25 Фантастыка «Дзень незалежнасці».**
**19.00 Фантастыка «Чужы: Увасхрашэнне».**
**21.45** Кіпень.
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**8.00, 11.30, 18.05, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.20, 23.20 «Вячэрні лабірынт». Камедыя.**
**9.30** «Бард-парад».
**10.10** «Наперад у мінулае».
**10.40** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**11.50 «Пан Валадыёўскі». Драма.**
**14.20** Канцэрт Лідзіі Чабаксаравай і арт-трыа «Вольніца».
**15.15** «Час кіно».
**15.25 «Шмат шуму з нічога». Камедыя.**
**17.10** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі Віктар Вуячыч.
**18.25 «Вакзал для двaіх». Меладрама.**
**20.40** «Калыханка».
**21.20** Joe Cocker: Fire it Up Live. Канцэрт.

### Беларусь 5

**8.05, 22.00** PRO спорт. Навіны.
**8.15** «Адзін дзень на шляху да Алімпу».
**8.55, 13.55** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету сярод юніёраў і моладзі. Заслаўе.
**12.40** Тэніс. Турнір WTA. Манрэаль. 1/2 фіналу.
**16.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**18.55** «Адзін дзень на шляху да Алімпу».
**19.30** «Жанчыны і спорт». Алена Леўчанка.
**20.00** Тэніс. Турнір WTA. Манрэаль. Фінал.
**22.10** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Венгрыя — Партугалія.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.45** «Фазэнда».
**11.20 Маст. фільм «Дарагі мой чалавек».**
**13.10** «Людзі, якія зрабілі Зямлю круглай».
**15.00** «Леанід Якубовіч. Фігура вышэйшага пілатажу».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Святочны канцэрт».
**18.15, 21.05** Музычны фестываль «Голосящий КиВиН».
**20.00** Контуры.
**22.00 Драма «Герцагіня».**
**23.50 Баявік «Беглы агонь».**



### СТБ

**6.00 «Турысты». Серыял.**
**7.35** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.55, 17.05** «Аўтапанарама».
**8.25** «Нам і не снілася».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 12». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.25 Маст. фільм «Асабістая справа суддзі Івановай».**
**15.20** «Вадзіць па-руску».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.50** «Наша справа».
**17.35** «Ваенная тайна».
